# 2023 год

# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

Звесткі з архіва
Нацыянальнай кніжнай палаты
Беларусі



*Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з’яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і  кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.*

*У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2023 год з’яўляецца юбілейным.*

**Сакавік: вершы / Еўдакія Лось. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Рэдакцыя мастацкай літаратуры, 1958. – 122, [1] с.**

# 65 гадоў




«Сакавік» – гэта першы зборнік вершаў Еўдакіі Лось (1929–1977), прадстаўніцы плеяды паэтаў «пасляваеннага пакалення». Назва кнігі сімвалічная, бо дзень нараджэння паэтэсы 1 сакавіка.

Выдавалася кніга ў друкарні імя Сталіна ў Мінску, падпісана да друку была 17.06.1958.

Тыраж склаў 4000 экзэмпляраў.

# «Сакавік: вершы» : 65 гадоў



Еўдакія Якаўлеўна Лось нарадзілася ў 1929 г. у вёсцы Старына, Ушацкага раёна, Віцебскай вобласці.

Пасля вайны закончыла Ушацкую сямігодку і паступіла ў Глыбоцкае педвучылішча.

Першы верш Е. Лось быў надрукаваны ў 1948 г., у час навучання яе ў педвучылішчы.

У 1955 г. Е. Лось закончыла Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага. З гэтага ж года яна — член КПСС.

У сучасны момант Е. Лось працуе рэдактарам Вучэбна-педагагічнага выдавецтва БССР.

Пачынаючы з 1956 г., маладая паэтэса актыўна выступае на старонках рэспубліканскага перыядычнага друку. Яе вершы друкуюцца ў часопісах «Полымя», «Беларусь», «Маладосць», «Работніца і сялянка», газетах «Літаратура і мастацтва», «Чырвоная змена» і іншых.

У 1957 г. Е. Лось прынята ў Саюз пісьменнікаў БССР.









Рэдактарам выдання стаў Алесь Звонак, а мастацкае афармленне выканаў Леанід Прагін.

Зборнік адкрываецца кароткай даведкай пра аўтара вершаў, з якой вынікае, што Еўдакія Лось у той час працавала рэдактарам Вучэбна-педагагічнага выдавецтва БССР. Вершы ў зборніку размеркаваны па чатырох раздзелах: «Мая любоў» (32 творы), «Сябры міру» (13 твораў), «Роздум» (20 твораў) і «Дзявочае» (15 твораў).

# «Сакавік: вершы» : 65 гадоў

Першы зборнік Е. Лось невыпадкова атрымаў вясновую назву – «Сакавік». Для паэтэсы гэта незвычайна-дзівосны час адраджэння прыроды, які выклікае радасць і атаясамліваецца з абуджэннем жыцця, пра што яна і гаворыць у аднайменным вершы, што ўключаны ў першы раздзел зборніка.

Вядомы беларускі літаратуравед Уладзімір Гніламёдаў, які захапляўся творчасцю Еўдакіі Лось і быў асбіста з ёю знаёмы, узгадваў: «Першая кніга называлася «Сакавік» — у месяцы сакавіку паэтэса нарадзілася, нават у гэтай акалічнасці, у гэтым супадзенні адбілася ўнутраная, душэўная ўстаноўка на непрыдуманае, перажытае, сваё. На гэта яе натхніў і Пётр Усцінавіч Броўка, калі ў канцы саракавых гадоў, ці не ў сорак восьмым нават, наведаў Глыбокае, дзе, сустракаючыся з выбаршчыкамі, спаткаў маладую паэтэсу — студэнтку Глыбоцкага педвучылішча Дусю Лось, паслухаў яе вершы, паверыў у яе творчыя сілы і падтрымаў. І Еўдакія Якаўлеўна засталася на ўсё жыццё ўдзячнай яму за гэта, вучылася ў яго зацікаўленаму і добраму погляду на жыццё…»

# «Сакавік: вершы» : 65 гадоў

Адным з найцудоўнейшых твораў зборніка «Сакавік» з'яўляецца верш «Роднай мове» (1957), які гучыць як узнёслая песня:

Табе складаю шчыры свой санет,
Прапрадзедаў маіх жывая мова, –
Майго народа першая аснова,
Душы яго шырокі, чысты свет!

Калі і я ў табе пакіну след,
Хай не на ўсю ступню, хай напалову, –
Твая заслуга, казачнае слова.
Адзнака новых радасных прыкмет!

Да глыбіні душы мяне хвалюе,
Як пазнаю цябе і прагна п'ю я,
Нібы вады з крыніцы мне далі.

І крочу, маладая, з асалодай
Па гэтай любай, сонечнай зямлі,
Дзе роднай мовай дадзена
валодаць!

# «Сакавік: вершы» : 65 гадоў

У зборнік «Сакавік» быў уключаны і верш «Маці», які літаратурныя крытыкі вызначаюць як адну з першых удач паэтэсы: «Дзякуй, маці, што мне падарыла ты любоў да зямлі маёй роднай, дзе ўсміхаецца сонца так міла, дзе бягуць хвалі рэк мнагаводных…».

Нямала прачулых радкоў у зборніку прысвечана бацьку, які памёр у 1942 годзе ад хваробы, брату, які быў афіцэрам Савецкай арміі і загінуў на фронце ў 1943 годзе, дзвюм сёстрам і, канешне, свайму, асабістаму, – таму, што хвалюе маладую дзяўчыну:

Ружа белая,
Нясмелая,
Прыгажуня
Чыстацелая!
Ранкам срэбраная,
Росная,
Днём распушана
Пялёсткамі.
Вечарком
Нібы жахаецца, –
На замочак
Замыкаецца…

Ах, не рвіце
Ружу белую,
Ружу белую,
Нясмелую
А ні ўночы,
Як хаваецца,
Ні як ранкам
Умываецца!
Пачакайце,
Каб прыбралася,
Моцы-сілачкі
Набралася…





# «Сакавік: вершы» : 65 гадоў

Да зборніка «Сакавік» Еўдакія Лось друкавала свае вершы ў розных часопісах. Дэбютным быў верш «Сэрца дзяўчыны», надрукаваны ў 1948 г. у часопісе «Работніца і сялянка».
Пасля «Сакавіка» было шмат іншых паэтычных зборнікаў: «Палачанка» (1962), «Людзі добрыя» (1963), «Хараство» (1963), «Яснавокія мальвы» (1967), «Вянцы зруба» (1969), «Перавал» (1971), «Галінка з яблыкам» (1973), «Лірыка» (1975), «Лірыка ліпеня» (1977).

У паэтэсы рос сын, таму яна не магла абысці ўвагай і «дзіцячыя» тэмы. Дзецям прызначаны зборнікі вершаў «Абутая елачка» (1961), «Казка пра Ласку» (1963), «Вяселікі» (1964), «Зайчык-выхваляйчык» (1970), «Дванаццаць загадак» (1974), «Смачныя літары» (1978), а таксама зборнік апавяданняў «Дзесяць дзён у Барку».

У 1979 г., ужо пасля смерці паэтэсы, выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.
У 1984 годзе свет убачыў зборнік Еўдакіі Лось «Валошка на мяжы», у якім сабрана паэзія апошніх гадоў жыцця таленавітай беларускай паэтэсы.
Еўдакія Лось працавала і ў жанры прозы, яна аўтар зборнікаў «Пацеркі» (1966), «Травіца брат-сястрыца» (1970), цыкла «Навелы пятага паверха».
Пераклала на беларускую мову кнігу вершаў С. Баруздзіна «Краіна, дзе мы жывём».

# «Сакавік: вершы» : 65 гадоў

Развіццё творчасці Е. Лось ад першага зборніка «Сакавік» да апошняга «Лірыка ліпеня» прасачыў даследчык В. Каваленка ў кнізе «Жывое аблічча дзён». У адным з артыкулаў гэтай кнігі «Ад сакавіка да ліпеня...» аўтар, у прыватнасці, пісаў: «Паэтэса адчувала шырокія філасофска-эстэтычныя магчымасці жаночай лірыкі і спадзявалася, што іх ажыццяўленне прывядзе да ўзбагачэння беларускай паэзіі».

Другі даследчык, Сцяпан Гаўрусёў,  гаворачы аб творчасці Еўдакіі Лось, вельмі слушна адзначаў, што «яе лепшыя творы… народжаны сапраўдным натхненнем і кранаюць сэрца арганічным спалучэннем маляўнічасці, шчырасці і музычнасці».

Творы Е. Лось перакладзены на трыццаць моў свету, сярод іх – амаль усе славянскія, мовы народаў СССР, англійская, французская, венгерская... Паэтэса была ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны», медалямі, ганаровымі Граматамі Вярхоўных Саветаў БССР і Латвійскай ССР.

